Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

9 КРАСАВІКА 2024 г. АЎТОРАК № 70 (30204)

ЗВЯЗДА

У ЧЫМ ПЕРАВАГА БІЯМЕТРЫЧНЫХ ДАКУМЕНТАЎ 5

ПАЭТЫЧНАЕ ГУЧАННЕ МЕМАРЫЯЛА 8

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«АСНОВА ЎСЯГО — ПРАЎДА»

Якія задачы пастаўлены перад новым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта

фота БелТА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў Уладзіміра Пярцова намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Да гэтага часу Уладзімір Пярцоў працаваў на пасадзе міністра інфармацыі Беларусі.

«Ідэалагічная работа сёння выходзіць на першы план. І прынята рашэнне аб накіраванні вас у Адміністрацыю Прэзідэнта на пасаду кіраўніка інфармацыйнай сферы ўвогуле ў краіне. Прызначаючы тут намесніка кіраўніка Адміністрацыі па эканоміцы (вы, напэўна, адсачылі), я яму казаў, што нам трэба неяк сканцэнтравацца і вывесці, выбудаваць піраміду. Шмат спецыялістаў добрых — міністэрствы, ведамствы, ва ўрадзе — і вывесці на намесніка Адміністрацыі Прэзідэнта работу ў эканоміцы. Гэтаксама трэба падцягнуць, прывесці ў парадак сродкі масавай інфармацыі ўсе, ідэалагічную работу і вывесці на намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Можа быць, нават мець камісію нейкую пад сваім кіраўніцтвам, каб параіцца, своечасова адрэагаваць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў наяўнасць ва Уладзіміра Пярцова добрага вопыту ў інфармацыйнай сферы. У яго біяграфіі — работа кіраўніком радыё і тэлебачання на абласным узроўні. Уладзімір Пярцоў узначальваў прадстаўніцтва МТРК «Мір» у Беларусі. «Вельмі самавітая, паважаная мною кампанія. Заўсёды да яе добра ставіўся. Якраз ваш перыяд, калі гэта кампанія ўзнялася», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што яму хацелася б, каб ідэалагічная работа ў краіне была прыведзена ў парадак. «Вы можаце размаўляць з людзьмі. Гэта рэдкасць для чалавека. Я заўсёды кажу, што штучны тавар, калі чалавек можа весці ідэалагічную работу», — сказаў ён. Па словах беларускага лідара, радыкальны крок — з пасады міністра на кіраўніка сродкаў масавай інфармацыі, ідэалагічнай работы ў краіне — гэта патрэбны і карысны ў гэтым кірунку крок. «Работы будзе вельмі многа. Але гэта вельмі самастойная работа. Не трэба думаць, што тут нехта — ці кіраўнік Адміністрацыі, ці хтосьці — будзе весці гэту работу. Не, гэта выключна ваша арганізацыйная работа. І кіраўнік Адміністрацыі, усе астатнія, я ў тым ліку, будзем вам дапамагаць. Трэба выбудаваць. Я спадзяюся, што вы гэта зробіце», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

УСЁ СЫШЛОСЯ НА СРОДКАХ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

Прэзідэнт прапанаваў абмеркаваць актуальныя пытанні ідэалагічнай работы: «А канкрэтна — прапаганды і контрпрапаганды. Цяпер гэтыя пытанні вельмі актуальныя ў гэты складаны перыяд для нашай краіны. Калі не сказаць, што самы складаны».

«Вядома, наколькі гэта магчыма, я інфармую грамадства і нашых людзей аб асноўных момантах. Але не хацелася б напружваць сітуацыю, каб людзі перажывалі, хваляваліся. Але ж я разумею, што сітуацыя нялёгкая. І ўсё сышлося цяпер на сродках масавай інфармацыі, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Цяпер гэтыя сектары нашага жыцця адыгрываюць важнейшую ролю наогул у развіцці Беларусі. Ідзе інфармацыйная вайна, перш за ўсё ў СМІ. Эканамічная вайна, інакш яе не назавеш. Мы робім усё для таго, каб зберагчы краіну ад гарачай вайны. Пакуль нам гэта ўдаецца. Думаю, што мы зможам вырашыць гэтую праблему — не дапусціць сутыкненні, як гэта было заўсёды на тэрыторыі Беларусі».

СТАР. 2

ПРЫЦЯГНЕННЕ РОДНАЙ ЗЯМЛІ

Марыну ВАСІЛЕЎСКУЮ, першага касманаўта незалежнай Беларусі, першую беларускую жанчыну ў космасе, чакалі на Зямлі не толькі яе родныя і блізкія — яе чакала ўся краіна. Калі ў Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі журналістка спытала, ці перажываў ён, адказ быў такі: «Калі твае дзеці будуць у космасе, зразумееш, што такое грамадзянка Беларусі, грамадзянін Беларусі ў космасе…»

Цяпер усе хваляванні ў мінулым — у суботу ў 10.17 па мінскім часе прыблізна за 150 км на поўднёвы ўсход ад горада Жэзказган у Казахстане пасадка касмічнага апарата прайшла ў штатным рэжыме. Пасля прылёту касманаўтам патрабуецца час для рэабілітацыі і аднаўлення, але нават падчас зусім кароткага інтэрв'ю пасля пасадкі Марына паспяшалася падзякаваць Беларусі за падтрымку, а яшчэ сказаць пра тое галоўнае, што, напэўна, лепш бачыць здалёк, з касмічнай вышыні: «Жадаю ўсім людзям на Зямлі, каб яны шанавалі і беражлі ўсё тое, што мы маем».

Цяпер Марына Васілеўская і яе камандзір Алег Навіцкі аднаўляюць сілы ў прафілактарыі Цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў у Зорным гарадку. Як кажуць спецыялісты, усё ідзе паводле плана, так што ўжо вельмі хутка мы зможам вітаць Марыну на роднай зямлі, прыцягненне якой — наймацнейшае.

фота БелТА

ЦЫТАТА ДНЯ

Ірына КАСЦЕВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях:

«Што датычыцца сацыяльнай абароны, то ключавое пытанне тут — пенсійнае забеспячэнне нашых грамадзян. Тэма пенсійнага забеспячэння хвалюе ўсіх — як сённяшніх пенсіянераў, якіх зараз у краіне пражывае 2,3 млн чалавек, так і будучых. Пытанні і прапановы актыўна паступаюць з суструэ з працоўнымі калектывамі, з прыёму грамадзян, вельмі шмат пісьмовых зваротаў, таму патрабуецца глыбокае, дэталёвае паглыбленне ў гэту тэматыку. Абавязкова на ўсіх пляцоўках разглядаць пытанне, вядома, ужо з партнёрам — Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны — і непасрэдна з выбаршчыкамі, звяртаючы асаблівую ўвагу на тыя пытанні, якія людзі ўзнімалі, ідучы на выбары».

Вяршыня народаўладдзя

ДЫНАМІЧНА І Ў АДПАВЕДНАСЦІ З КАЛЯНДАРНЫМ ПЛАНАМ

Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА паведаміў, як праходзіць фарміраванне Усебеларускага народнага сходу

Усяго будзе выбрана 290 дэлегатаў ад усіх абласцей краіны, 60 дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў стануць дэлегатамі аўтаматычна. Яшчэ 400 чалавек вылучаюцца ад пяці структур грамадзянскай супольнасці. Кожная з іх на сваіх найвышэйшых органах кіравання — з'ездах, канферэнцыях у залежнасці ад статута — выбірае па 80 сваіх прадстаўнікоў.

«Выходзячы з інфармацыі, якая ёсць у нас, у тым ліку дзякуючы і сродкам масавай інфармацыі, усё праходзіць даволі дынамічна, у адпаведнасці з тым календарным планам, які мы зацвердзілі, і тымі нормамі заканадаўства, якія вызначаюць парадак выбрання дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу», — паведаміў Ігар Карпенка.

Ён звярнуў увагу на значнасць і важнасць УНС як стабілізатара грамадскага развіцця і падкрэсліў, што з набыццём канстытуцыйнага статусу Усебеларускі народны сход атрымлівае ўласна свае паўнамоцтвы, не дублюючы іншыя функцыі.

СТАР. 2

Жыллё

Кватэры разлятаюцца як гарачыя піражкі

Хоць цэны дасягнулі максімуму за 9 гадоў

Сёлета на другасным рынку продажу кватэр у Мінску традыцыйнага для пачатку года рэзкага зніжэння пакупніцкай актыўнасці не адбылося. Як вынік — упершыню за 9 гадоў сярэдняя цана прададзеных кватэр перавысіла 1450 умоўных адзінак за квадратны метр.

У лютым па папярэдніх падліках купілі звыш 1,5 тысячы кватэр, што на 27 % больш чым за папярэдні месяц. Але куды больш паказальны той факт, што бягучы попыт з'яўляецца максімальным для гэтага месяца, устанавіўшы новы рэкорд. Студзень і люты паказалі самы выніковы пачатак года за ўсю гісторыю назірання.

СТАР. 2

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэзідэнтам Славакіі выбраны Петэр Пелегрыні

Петэр Пелегрыні, лідар партыі «Голас — сацыяльная дэмакратыя» і прыхільнік хуткага ўрэгулявання канфлікту ва Украіне, быў выбраны прэзідэнтам Славакіі, паведаміла ТАСС. Пелегрыні падтрымалі 53,12 працэнта выбаршчыкаў. Аб гэтым заявіла Дзяржаўная выбарчая камісія. Экс-кіраўнік МЗС Славакіі Іван Карчох атрымаў 46,87 працэнта галасоў. Ён павіншаваў Пелегрыні з перамогай і заўважыў, што як спартсмен умее прымаць паражэнне. Прэзідэнт Славакіі Петэр Пелегрыні заявіў на сваёй першай сустрэчы пасля перамогі на выбарах, што будзе прымаць усе магчымыя меры для таго, каб яго краіна заставалася прыхільнікам міру, а не вайны.

У Габоне праходзіць агульнанацыянальны дыялог

Агульнанацыянальны дыялог разгарнуўся ў Габоне, яго мэтай з'яўляецца падрыхтоўка новай канстытуцыі. Пра гэта заявіў кіраўнік краіны на пераходны перыяд Брыс Алігі Нгема, паведаміла ТАСС. «Дыялог з'яўляецца вырашальным момантам, — прыводзіць яго словы радыёстанцыя RFI. — Яго рашэнні будуць увасоблены ў тэкст, а пасля вынесены на рэферэндум па новай канстытуцыі». У рабоце скліканага па ініцыятыве ўлад агульнанацыянальнага дыялогу ўдзельнічае каля 600 чалавек, якія прадстаўляюць больш чым 100 партый, рухаў і арганізацый грамадзянскай супольнасці. Урачыстае адкрыццё форуму адбылося напярэдадні ў Палацы спорту ў сталіцы краіны Лібрэвілі. Работа форуму завершыцца 30 красавіка. Мэта дыялогу — вызначыць шляхі далейшага развіцця краіны, у тым ліку за кошт прыняцця новай канстытуцыі.

111-гадовы брытанец стаў найстарэйшым мужчынам у свеце

Джон Тынісвуд з графства Мерсісайд у Англіі стаў найстарэйшым мужчынам у свеце. Прадзядуля, якому на 5 красавіка было 111 гадоў і 223 дні, тлумачыць сваё даўгалецце спажываннем традыцыйнай брытанскай стравы — рыбы са смажанай бульбай па пятніцах і рэгулярнымі пешымі паходамі ў юнацтве. Тынісвуд цяпер жыве ў доме састарэлых у горадзе Саўтпарт. Ён раіць «трэніраваць розум» і праяўляць «умеранасць» ва ўсім. Тынісвуд, балельшчык футбольнага клуба «Ліверпуль», нарадзіўся ў Саўтпарце 26 жніўня 1912 года. Ён працаваў у буйных кампаніях — Royal Mail, Shell і BP — да выхаду на пенсію ў 1972 годзе. У якасці рэцэпта даўгалецця ён рэкамендуе «ніколі не перагружаць арганізм», каб захаваць здароўе, а таксама ладзіць з людзьмі. Найстарэйшай з жанчын лічыцца іспанка Марыя Браньяс Марэра, якая нядаўна адсвяткавала сваё 117-годдзе.

ISSN 1990 - 763X

240070

КАРАТКА

• У віцебскі Свята-Успенскі кафедральны сабор прыбыла нацыянальная святыня — крыж святой прападобнай Ефрасінні, ігуменні Полацкай.

• У Беларусі з рабочым візітам знаходзіцца кубінская ваенная дэлегацыя на чале з камандуючым СПА і Рэвалюцыйнымі ВПС Кубы. У час абмену думкамі Беларусь і Куба выказалі ўзаемную зацікаўленасць у развіцці кантактаў па лініі ВПС і СПА.

• У Беларусі ў студзені—лютым зафіксаваны самы высокі рост вытворчасці сельгаспрадукцыі сярод краін Еўразійскага эканамічнага саюза.

• У распрацоўцы біялагічным заказніку «Споравскі» для турыстаў пачалі арганізоўваць паездкі ў месцы пражывання турпадобнай жывёлы і тарпанападобных коней.

Соцыум

ЦАНА ХАЛАТНАСЦІ, НЯЎВАГІ І П'ЯНСТВА

На пашыраным выязным пасяджэнні камісіі па прафілактыцы вытворчага траўматызму і прафесійнага захворвання пры Мінгарвыканкаме разгледзелі меры, якія прымаюцца для зніжэння ўзроўню вытворчага траўматызму пры выкананні работ на будаўнічых аб'ектах сталіцы. Яго ўдзельнікамі сталі прадстаўнікі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, будаўнічых арганізацый і прамысловых прадпрыемстваў сталіцы, раённых адміністрацый, а таксама галоўныя тэхнічныя інспектары прафсаюзаў.

У адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай «Рынак працы і садзейнічанне занятасці» 2024 год аб'яўлены Годам бяспечнай працы ў будаўніцтве. Таму самая пільная ўвага аддаецца будаўнічай галіне. Гэта падкрэсліла **першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Надзея ЛАЗАРЭВІЧ.**

СТАР. 2

«АСНОВА ЎСЯГО — ПРАЎДА»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт звярнуў увагу, што закапёршчыкамі ўсяго, ініцыятарамі з'яўляюцца беглыя. «Мы абсалютна ведаем, чым яны там займаюцца. Бегаюць па розных цэнтрах прыняцця рашэнняў і саветнікам ад Амерыкі да Бруселя, просяць грошы. І самае галоўнае: «Дайце на СМІ, на СМІ, на СМІ!» На што куратары ім гаворадь: «Хлопцы, у СМІ ўжо былі, трэба нешта гарачэйшае». Накшталт маскоўскага гэтага «Крокус Сіці», не дай бог, тэракты. І ўзброенае супрацьстаянне ў Беларусі. Мэта — зайсці ў Беларусь і хоць бы калвалачак зямлі захапіць, аб'явіць уладу сваю і паклікаць сюды замежных... Ну не наймітаў, а ўжо войскі... Яны ж — «улада», — сказаў ён. Па словах кіраўніка дзяржавы, у Беларусі гэта разумеюць і бачаць, бачаць у тым ліку і тое, колькі выдзяляюць грошай. «Вы аб гэтым гаварыце ў СМІ шчыра і сумленна, гэта сапраўды так. Грошы раскрадаюцца, іх не хапае», — заўважыў ён.

Аляксандр Лукашэнка згадаў аб падрыхтаваным для яго свежым аглядзе сродкаў масавай інфармацыі, уключаючы медыярэсурсы апанентаў. «Выплюхнулася ад іх (не наша контрпрапаганда) у сродкі масавай інфармацыі — гэтыя чаты і telegram-каналы, — дзе яны там аб'ектыўна раказваюць (мы пра гэта ведалі і ведаем), што прысвойвае грошы, куды ідуць грошы, якія хто гадзіннік і трусы носіць. Усе распісваюць адзін ад адным, — адзначыў Прэзідэнт. — Так яно і будзе. Таму што ёсць больш радыкальныя людзі, якія клапоцяцца не толькі аб тым, каб надзець гадзіннік за 9 тысяч долараў або прыгожы касцюм, макіяж зрабіць. А якія хочуць і паваяваць, і ўладу захапіць. Ёсць і тыя, хто нажыцца на гэтым імкнецца. Я папярэджваў сілавікоў і нашы спецслужбы аб тым, што гэта будзе. Вось яно і здарылася».

НЕКАТОРЫЯ НЕ СУПРАЦЬ ПАВАЯВАЦЬ

Прэзідэнт таксама заўважыў, што ёсць радыкальна настроеныя сілы, заходнія куратары беларускіх збеглых, якія хацелі б давесці сітуацыю да ўзброенага супрацьстаяння. «Гэтых небаракаў закінулі ва Украіну, назвалі «палком Каліноўскага». Там больш за сотню чалавек. Як яны ваююць, мы таксама ведаем. Праўда, я не зусім разумею ўкраінцаў — навошта ім абвастрашь адносіны з Беларуссю. У гэтай сітуацыі, калі дзве дзяржавы, адзін народ фактычна, сутыкнуліся лоб у лоб, заўсёды патрэбна трэцяя сіла. І ў гэтым выпадку так вымалёўвалася, што Беларусь і Расіі патрэбна будзе такая — міралюбівая, спакойная, і Украіне, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Але я гляджу, няхай тонка, акуратна, але нават Валодзя Зяленскі пачынае чапляць нас і прышпільваць незразумела да якіх працэсаў. Вось я не ведаю, Уладзіміру Аляксандравічу Зяленскаму навошта гэта. Паглядзіце на паводзіны Прэзідэнта Расіі. Ён вельмі акуратны, асцярожны. Ён разумее: рана ці позна ўсё роўна да міру прыйдзем. Які мір будзе, гэта ўжо залежыць ад іх, гэта не наша пытанне. Але Беларусь спакойная, міралюбівая ім патрэбна будзе. Не, вось пачынаюць падкручваць, падверчваць. І я не магу ў гэтым плане пакрыўдзіцца на ваенных (украінскіх). Ваенныя якраз сябе паводзяць больш-менш акуратна, асцярожна. Хоць яны робяць сваю справу, брудную справу — з гэтымі тэрактамі, атакамі і іншае. Мы гэта добра ведаем па граніцы з Украінай», — дадаў беларускі лідар.

ШТО СУПРАЦЬПАСТАВІЦЬ ІНФАРМАЦЫЙНА-ПСІХАЛАГІЧНЫМ АПЕРАЦЫЯМ

Кіраўнік дзяржавы ў цэлым падкрэсліў, што сітуацыя нялростая і часам у ёй цяжка разабрацца, а беглыя ўвесь час падштурхоўваюць гэты інфармацыйны парадак дня. «Яны ўвесь бруд цяпер збіраюць. Вось мы з вамі сустрэліся — чакайце, з заўтрашняга дня вас пачнуць выварочваць навыварат і будуць перапісваць, куды вы ездзілі, лёталі, што вы рабілі, з кім вы сустракаліся. І іншае, іншае... Гэта іх цяпер парадак дня. Як мы мякка называем, інфармацыйна-псіхалагічныя аперацыі. На гэта яны робяць стаўку. Хоць іх куратары схіляюць да ўзброенага супрацьстаяння. І тое, і іншае не проста».

Аляксандр Лукашэнка арыентуе весці інфармацыйную барацьбу з апанентамі выключна на аснове праўдзівых фактаў. «Калі патрэбныя інфармацыйна-псіхалагічныя аперацыі, гэта мы можам зрабіць проста. Але аснова ўсяго — праўда, — падкрэсліў беларускі лідар. — Любыя псіхалагічныя аперацыі — яны нічога не вартыя, калі ў аснове не ляжыць праўда. Нам не трэба нічога прыдумляць. Вазьміце, дапусцім, інфармацыйна-псіхалагічныя аперацыі на мяжы. Навошта нам хлусіць? Паглядзіце, колькі трупаў валяецца сёння на мяжы. Снег сышоў — жах. Мне кожную раніцу дакладваюць. Яшчэ больш выкідваюць іх. Вось вам псіхалагічныя аперацыі — здымай і паказвай гэтых нягодніка, якія забіваюць людзей і выкідваюць на нашу тэрыторыю. Гэта як прыклад. І такіх прыкладаў можна шмат прывесці».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўсе гэтыя факты трэба збіраць і інфармаваць людзей. «Трэба загадзя рыхтаваць нашых людзей да таго, што можа быць, асабліва ў эру штучнага інтэлекту. Хлусні яшчэ будзе дастаткова», — папярэдзіў ён.

Паводле БелТА.

У тэму

Аляксандр Лукашэнка паставіў канкрэтныя задачы па арганізацыі работы ў частцы прапаганды і контрпрапаганды, расказаў журналістам Уладзімір Пярцоў.

«Інфармацыйная вайна і тая гібрыдная вайна, якая ў адносінах да нашай краіны вядзецца групай заходніх дзяржаў, нікуды не падзелася. Яны намацваюць і шукаюць новыя каналы ўздзеяння на нашых людзей. Уздзеянне перш за ўсё з дапамогай разнастайных лічбавых і сінтэтычных тэхналогій і цэнтраў інфармацыйна-псіхалагічных аперацый. І тых, каго мы завём «медыяпадобнымі» — блогераў і гэтак далей, праз сацыяльныя сеткі, каб дастукацца да сэрцаў, абагаціць і выклікаць пэўныя негатыўныя эмоцыі. Для гэтага мы павінны актыўна ўжывць тыя метады, якім мы навучыліся за апошнія тры-чатыры гады, — метады эфектыўнай контрпрапаганды той хлуснi, якая адносна нашай краіны, гістарычнай праўды, адносна нашага Прэзідэнта льецца з-за мяжы», — сказаў Уладзімір Пярцоў.

Ён падкрэсліў, што важна таксама эфектыўна даносіць да людзей усё тое добрае, што робіцца ў краіне, прапагандавадь культурныя і гістарычныя каштоўнасці: «Нам ёсць чымганарыцца. У нас ёсць дасягненні, памяць, якая засталася ад нашых продкаў. Мы — нашчадкі народа-пераможца ў Вялікай Айчыннай вайне. Мы павінны гэта памятаць. Калі мы пра гэта забываем, сёй-той іншы спрабуе на сябе перацягнуць гэтую коўдру».

Уладзімір Пярцоў адзначыў, што за апошнія 30 гадоў незалежнасці Беларусі шмат зроблена. У гэтым плане дастаткова параўнаць становішча спраў у краіне ў пачатку 90-х, калі часам не было нават элементарных запасаў прадуктаў харчавання, і цяпер. Самай галоўнай ён лічыць задачу дастукацца да сэрцаў людзей праз усе магчымыя каналы ўзаемадзеяння: СМІ, сацыяльныя сеткі і розныя платформы, і ў тым ліку кінематограф.

ДЫНАМІЧНА І Ў АДПАВЕДНАСЦІ З КАЛЯНДАРНЫМ ПЛАНАМ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

«А гэта своеасаблівы стабілізатар грамадскага развіцця. То-бок гэта запыт да пастаяннага дыялогу розных органаў дзяржаўнага кіравання і грамадзянскай супольнасці і рашэнне надзённых праблем, што хвалююць сёння нашых грамадзян, наш народ, які з'яўляецца адзінай крыніцай улады ў краіне», — заўважыў старшыня ЦВК. Прадцягваючы тэму паўнамоцтваў УНС, Ігар Карпенка заznачыў, што УНС будзе вызначаць стратэгію развіцця дзяржавы і грамадства. Менавіта ён будзе зацвярджаць Ваенную дактрыну і Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Акрамя таго, яму перададзены функцыі выбрання суддзяў Канстытуцыйнага і Вярхоўнага судоў, старшыні і членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі. Гэта зроблена ў адпаведнасці з даручэннямі Прэзідэнта накont перараспрацаванага паўнамоцтвы, у тым ліку і ад Прэзідэнта, — іншым органам дзяржаўнага кіравання.

Слыніўся старшыня ЦВК і на іншых электаральных кампаніях. Так, ён адзначыў, што 4 сакавіка адбыліся выбары членаў Савета Рэспублікі: ад кожнага рэгіёна краіны, у тым ліку і горада Мінска, выбрана па восем членаў, яшчэ восем — назначаюцца Прэзідэнтам. Канчатковыя вынікі выбараў будуць падведзены на пасяджэнні Цэнтральнай выбарчай камісіі. На гэтым пасяджэнні таксама прымецца рашэнне аб скліканні сесіі Савета Рэспублікі.

Гаворачы пра прэзідэнцкія выбары, якія павінны адбыцца ў наступным годзе, Ігар Карпенка заznачыў, што рашэнне аб іх назначэнні — прэрагатыва Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. «Правёўшы адзіны дзень галасавання, сфарміраваўшы абедзве палаты парламента, выбраўшы дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу і арганізаваўшы яго работу, мы ўступаем у падрыхтоўчы перыяд прэзідэнцкай выбарчай кампаніі. Такім чынам, мы завершым гэты важны электаральны цыкл па фарміраванні ўсіх органаў дзяржаўнай улады ў адпаведнасці з абноўленай Канстытуцыяй, якую мы прынялі на рэспубліканскім рэферэндуме ў 2022 годзе», — акцэнтаваў Ігар Карпенка. Ён падкрэсліў, што Палата прадстаўнікоў павінна будзе прыняць рашэнне аб назначэнні выбараў Прэзідэнта, пасля чаго Цэнтральная выбарчая камісія на сваім пасяджэнні зацвердзіць каляндарны план арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў. Пачнецца працэс фарміравання адпаведных камісій, працэс вылучэння кандыдатаў, іх рэгістрацыі, і непасрэдна правядзенне самога дня галасавання.

Паводле БелТА.

Да ведама членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання

12 красавіка 2024 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 9) пачне работу першая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь восьмага склікання. Рэгістрацыя членаў Савета Рэспублікі адбудзецца з 9.00 да 9.30.

ЦАНА ХАЛАТНАСЦІ, НЯЎВАГІ І П'ЯНСТВА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У першым квартале бягучага года мы сутыкнуліся з дастаткова сур'ёзнай сітуацыяй: у студзені ў выніку падзення з вышыні загінуў будаўнік, у лютым два работнікі малых прадпрыемстваў без ведамаснай падпрадкаванасці атрымалі смяротныя ўдары электрычным токам, — адзначыла яна. — Таму мы пазапланава вырашылі правесці выязное пасяджэнне камісіі па прафілактыцы выторчага траўматызму пры Мінгарвыканкаме. Работа па выяўленні і ўстараненні патэнцыяльных прафесійных рызык дае станоўчы эфект толькі тады, калі прасочваецца асабістая зацікаўленасць кожнага — ад радавога работніка да кіраўніка самага высокага рангу. З улікам значнага ўплыву на паказчыкі траўматызму так званага чалавечага фактару нам неабходна паставіць задачы кіраўнікам і выпрацаваць планы работы, якія дазволілі б не дапусціць на працягу года росту няшчасных выпадкаў на выторчасці. Так, па выніках работы за першы квартал 2024 года, па ўсіх паказчыках адзначаецца зніжэнне ўзроўню выторчага траўматызму. Дынаміка станоўчая, аднак пакуль людзі гінуць і атрымліваюць траўмы, супакойвацца і расслабляцца нельга.

Як паведаміла **начальнік Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Надзея КАЗЛОЎСКАЯ,** за студзень — сакавік 2024 года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2023-га агульны ўзровень выторчага траўматызму ў Мінску знізіўся на 27 % (з 74 да 54 траўміраваных). На 25 % зменшыўся паказчык па загінулых работніках (з 4 да 3) і на 37,8 % скарацілася колькасць цяжкіх траўмаў (з 37 да 23 адпаведна).

— Аднак пры дэталёвым аналізе абставін і прычын траўматызму выкрываюцца сур'ёзныя праблемы і недапрацоўкі як з боку наймальнікаў, так і работнікаў. Неабходна ўдасканальваць каардынацыю дзейнасці за выкананнем заканадаўства ад ахове працы. Патрабуецца распрацоўка спецыяльных прафілактычных мерапрыемстваў, а таксама сістэмны кантроль за ходам іх выканання як у арганізацыях, так і ў адміністрацыях раёнаў, — адзначыла Надзея Казлоўская.

У арганізацыях камунальнай формы ўласнасці сёлета за тры месяцы адбылося дзевяць няшчасных выпадкаў з цяжкім зыходам, у тым ліку адзін групавы з двума пацярпелымі (за аналагічны перыяд 2023-га зафіксавана толькі чатыры няшчасныя выпадкі). З трох смяротных выпадкаў адзін работнік загінуў на будаўнічай пляцоўцы і тры былі цяжка траўміраваны (летась за аналагічны перыяд загінулі два чалавекі і восем цяжка траўміраваны).

Пры гэтым сёлета ў сталіцы знізіўся паказчык па колькасці работнікаў, якія атрымалі траўмы ў выніку ДТЗ — іх было два, прычым яны цяжка траўміраваны, за аналагічны перыяд 2023 года ў ДТЗ пацярпелі чатыры работнікі, з іх адзін загінуў і тры былі цяжка траўміраваны.

Актуальнай застаецца і праблема п'янства на выторчасці. За першы квартал утрая павялічылася колькасць загінулых работнікаў, якія знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення (з 1 да 3 чалавек). У сувязі з гэтым разглядаюцца пытанні павышэння эфектыўнасці прафілактыкі п'янства і алкагалізму.

У прыватнасці, прапанавана прафілактычныя меры па барацьбе з п'янствам на выторчасці прадугледжваць загадзя пры распрацоўцы палажэнняў аб прэміраванні, правілаў унутранага працоўнага распарадку, службовых абавязкаў, калектыўных дагавораў, а таксама іншых лакальных прававых актаў. Калі работнік будзе дакладна ведаць, што яго з'яўленне на рабоце ў нецвярозым выглядзе адразу ж будзе заўважана службовымі асобамі, то такіх дзеянняў ён не зробіць і выпадкі траўматызму будуць адзінкавыя.

За тры месяцы мабільныя групы па пытаннях аховы працы Мінгарвыканкама і адміністрацый раёнаў правялі 195 абследаванняў, падчас якіх выявілі звыш 2,4 тысячы парушэнняў заканадаўства аб ахове працы. Адмысловаю ўвагу аддавалі арганізацыям, у якіх адбыліся няшчасныя выпадкі на выторчасці.

На пасяджэнні таксама былі заслуханы прадстаўнікі наглядных органаў і кіраўнікі прадпрыемстваў, на якіх адбыліся трагедыі і дапушчаны шматлікія парушэнні норм аховы працы.

— Падчас другога квартала неабходна сур'ёзна праверыць тыя памыланні, якія дзяржаўныя прадпрыемствы здаюць у арэнду суб'ектам гаспадарання, што займаюцца выторчай дзейнасцю. Праверыць трэба масава, ва ўсіх раёнах горада. Арэндадаўцы павінны ведаць, што адбываецца на здадзеных у арэнду плошчах — недапушчальна, калі там гінуць людзі. Захаванне жыцця і здароўя грамадзян у працэсе працоўнай дзейнасці — прыярытэт дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы працы. Кіраўнікам усіх узроўняў сумесна з прафсаюзамі важна забяспечыць сістэматычны кантроль за выкананнем норм і правілаў па ахове працы, а работнікі не павінны грэбаваць элементарнымі патрабаваннямі бяспекі, якім вы навучаны і праінструктаваны, — рэзюмавала Надзея Лазарэвіч.

Алена КРАВЕЦ.

Тым часам

СЯЎБА ПАВІННА БЫЦЬ БЯСПЕЧНАЙ

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны звярнае асаблівую ўвагу на арганізацыю работы па ахове працы пры праяўленні весенняй пасяўной кампаніі. Для забеспячэння бяспечнага выканання сельскагаспадарчых работ працадаўцы абавязваны ажыццявіць да пачатку праядзення работ падрыхтоўку працоўных месцаў, на якіх будуць занятыя работнікі. Пры гэтым забяспечыць бяспеку працы на ўсіх этапах.

Пры размяшчэнні працоўных месцаў павінны быць устаноўлены небяспечныя зоны, да якіх трэба аднесці, у тым ліку, зоны работ сельскагаспадарчых машын. Асаблівую ўвагу необходна ўдзяліць бяспечнай эксплуатацыі і тэхнічнаму стану сельскагаспадарчай тэхнікі. У гэтых мэтах прызначаюцца службовыя асобы, адказныя за: спраўны стан сельскагаспадарчых машын; бяспечную іх эксплуатацыю, тэхнічнае абслугоўванне; выпуск на лінію ў спраўным стане.

Кватэры разлятаюцца як гарачыя піражкі

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

У той жа час, напрыклад, прапанова кватэр у базе жыллёвага партала Realt у параўнанні з папярэднім месяцам гэтак жа вырасла — на 40 %. Такі значны рост колькасці прапаноў ад продажы кватэр звязаны з тым, што ў лютым некаторыя сталічныя агенцтвы актыўна дадавалі значную колькасць аб'яў аб продажы кватэр у асобных новабудоўлях. Новыя кватэры ў таблцах прапаноў з'явіліся пераважна ў Маскоўскім, Цэнтральным і Кастрычніцкім раёнах. Але калі з разлікаў выключыць кватэры ў новабудоўлях, то выбар на другасным рынку за месяц, наадварот, скараціўся на 6 %.

АСНОЎНЫ ПОПЫТ НА АДНАПАКАЁЎКІ

Найбольшую перавагу пакупнікі традыцыйна аддавалі аднапакаёвым кватэрам. Іх доля ў агульным ліку здзелак складала 43 %, што крыху меншы, чым у мінулым месяцы. У 32 % выпадкаў выбіралі двухпакаёвыя кватэры і ў 21 % — трохпакаёвыя.

Пры гэтым кватэры ў новых гатовых дамах, уведзеных ў эксплуатацыю ў 2022—2023 гадах, купілялі радзей — у 9 % выпадкаў, што на тры працэнтныя пункты менш, чым у студзені.

Сярод раёнаў часцей за іншыя выбіралі Кастрычніцкі, Цэнтральны і Маскоўскі, радзей — Савецкі і Ленінскі. Менш, чым у іншыя месяцы, пакупнікі цікавіліся кватэрамі ў сучасных панэльных і каркасных дамах. Часцей выбіралі тыпавыя і старыя панэльныя дамы.

ДВА МЕСЯЦЫ ЎПЭЎНЕНАГА РОСТУ

У студзені цана квадратнага метра ўсіх відаў кватэр павялічылася на 1 %, а ў лютым — яшчэ на 1,5 %. І гэта нядзіўна, бо, паводле законаў эканомікі, разам з ростам попыту расце і сярэдні кошт прададзеных кватэр у Мінску. На пачатак сакавіка сярэдняя цана жыллёвага «квадрата» вырасла да 1451 долара за квадратны метр, устанавіўшы новы рэкорд за 9 гадоў. Істотна падаражэлі аднапакаёвыя кватэры — плюс 1,8 %.

У залежнасці ад колькасці пакояў сітуацыя была наступнай (плюс медыяна абсалютных коштаў): аднапакаёвыя кватэры: 1561 долар за квадратны метр, дзе сярэдні кошт усягo памяшкання — $53 400; двухпакаёвыя кватэры: 1383 долары (плюс 1,2 %) — $62 800.

Трохпакаёвыя кватэры таксама дадалі, але значна менш — прыкладна 0,3 % за месяц — і склалі 1320 долараў ($83 000). Мінімальным быў попыт у лютым толькі на чатырохпакаёвыя кватэры, таму гаспадары такога жылля не адважыліся рухаць свой цэннік, які застыў на ўзроўні 1260 долараў за квадратны метр ($90 750).

Цэны на жыллё растуць менавіта ў сталіцы і ў абласных цэнтрах нашай краіны. Узнікае слушнае пытанне: чаму гэта адбываецца ў не самы багаты для насельніцтва час? Аналітыкі, блізкія да рынку нерухомасці, лічаць, што такім чынам вядзецца самае бяспечнае ўкладанне грошай. Раней былі варыянты на набыццё замежных каштоўных папер і замежнай валюты. На фінансавым рынку каштоўных папер сёння практычна няма нікіх прапаноў, у тым ліку і айчынных карпаратыўных аблігацый. Не рашаецца цяпер больш багатая частка нашага насельніцтва адкладаць досыць вялікія сумы ў замежнай валюце. А жыллё менавіта ў Мінску — заўсёды ліквідны тавар.

БЕЗ АЗДАБЛЕННЯ — ТАННЕЙ

Сярэдняя цана прапановы за люты паказала адмоўную дыналміку. У параўнанні з папярэднім месяцам яна знізілася на 2,1 % — да 1329 долараў за квадратны метр. Адбылося гэта ў першую чаргу за кошт размяшчэння вялікай колькасці дарагіх тыпавых аб'яў ад продажы кватэр у асобных новабудоўлях з больш нізкім коштам, чым у сярэднім па другасным рынку.

Па апісаных вышэй прычынах за люты мы назіраем зніжэнне сярэдніх цэн прапановы па ўсіх тыпах кватэр, а найбольш — у аднапакаёвых (мінус 3,6 %). Даныя разлічаны з улікам кватэр у новабудоўлях, многія з якіх не маюць міжпакаёвых сцен і па змоўчанні трапляюць у катэгорыю аднапакаёвых кватэр, штучна прынiжаючы сярэдні кошт квадратнага метра дадзенай катэгорыі пры вялікіх плошчах. Але такія новабудоўлі без аздаблення і шмат чаго яшчэ можна лічыць другасным жыллём з вялікай нацяжкай.

Калі зрабіць разлікі, то, згодна з імі, без уліку новабудоўляў сярэдні кошт прапановы квадратнага метра ў лютым 2024 года складаў 1492 долары (плюс 1,1 % за месяц). За тыдзень 2024 года ў большасці мікрараёнаў горада назіраўся рост сярэдніх цэн, значней за ўсё цэны прапановы на жыллё павялічыліся ў мікрараёнах Усход, Сцяпянка і Брылевічы.

ЦЭНАВЫ РЭКОРД І КОШТ У СУСЕДЗЯЎ

Самая дарагая кватэра, набытая ў лютым, абышлася пакупніку ў 352 тысячы долараў (або 1625 долараў за квадратны метр) агульнай плошчай 216 квадратных метраў. Гэта пяціпакаёвая кватэра вялікага метражу. Знаходзіцца яна ў элітным жылым доме клубнага тыпу ў пяці хвілінах хадзьбы ад плошчы Перамогі і парку Горкага на вуліцы Захарава.

Сярод найбліжэйшых буйных гарадоў суседніх краін у параўнанні з папярэднім месяцам кошты ў доларавым эквіваленце выраслі толькі ў Варшаве — плюс 0,9 %, устанавіўшы новы цэнавы рэкорд (4312 долараў за квадратны метр). У Маскве і Санкт-Пецярбургу цэны, наадварот, паказалі зніжэнне на 2,2 % і 2,8 % адпаведна (2971 і 2197 долараў).

Нашы лічбы (1451 долар) з'яўляюцца абсалютным рэкордным паказчыкам, які больш характэрны для вясны і пачатку лета, але не для самага пачатку года, калі людзі яшчэ знаходзяцца ў рэжыме чакання і глядзяць на тое, што будзе з курсам валют і з сітуацыяй на рынку. Апроч асноўнай прыводзяцца яшчэ тры прычыны. Гэта працяглая міграцыя пакупнікоў з першасняга на другасны рынак па прычыне звужэння прапаноў новабудоўляў. Акрамя таго, гэта маленькая стаўка крэдытавання і стабільны абменны курс валют.

ДОБРЫЯ НАВІНЫ ДЛЯ ЧАРГАВІКОЎ

А цяпер навіна для тых, хто збіраецца будавацца, выкарыстоўваючы льготныя крэдыты. Сёлета ў Беларусі дзяржаўныя забудоўшчыкі змогуць узводзіць дамы, выкарыстоўваючы льготныя крэдыты, і ў далейшым пераноўваць «квадраты» тым, хто мае ў гэтым патрэбу. На практыцы гэта значыць, што льготны крэдыт першапачаткова будзе атрымліваць не чаргавік, а дзяржаўны забудоўшчык пад 2 % гадавых у межах каштарыснага кошту будаўніцтва жылога дома. За гэтыя сродкі кватэра будуецца, а потым будзе перадавацца чаргавіку па дагаворах куплі-продажу. Па словах спецыялістаў, механізм такога жыллёвага будаўніцтва дазваляе забяспечыць стабільнае фінансаванне аб'екта і бесперапыннае яго будаўніцтва ў строга нарматыўных тэрмінаў.

«Чаргавікі змогуць купіць гатовыя кватэры з аздабленнем, а не ўступаць у будаўніцтва на розных яго этапах, — тлумачаць у Міністэрстве архітэктуры і будаўніцтва. — Такім чынам, тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, вызваляць ад удзелу ў інвестыцыйным працэсе будаўніцтва.

Будучым навасельцам прапануюць кватэры ў канкрэтных жылых дамах, дзе кошт «квадрата» ўжо сфарміраваны. Яны змогуць з дзяржпадтрымкай выкупіць пабудаваныя кватэры, выкарыстоўваючы крэдыт у рамках Указа Прэзідэнта № 13 альбо № 240.

Праект гэтай навіны мае на ўвазе, што калі кватэры ў доме не будуць прададзеныя на працягу чатырох месяцаў пасля заканчэння будаўніцтва, іх выкупіць выканкам за бюджэтныя сродкі, а затым перавядзе ў арэнднае або сацыяльнае жыллё, альбо сталічныя метры будуць рэалізаваны праз аўкцыён.

БУДУЦЬ ПРАДАВАЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ПУСТЫЯ ЎЧАСТКІ

Дзяржава будзе гандляваць цяпер і катэджамі. Днямі на рынку індывідуальнага будаўніцтва адбыўся прыкметны зрух — ляснасы пачалі прапаноўваць гатовыя дамы. Не хочаш дапякаць сябе з будоўляй — бяры драўляны катэдж (балазе праектаў шмат, ёсць з чаго выбраць), стаўляй яго на сваім участку і жыві.

Яшчэ раней свае паслугі рэкламавалі ДБК, гатовыя збіраць адна-двухпавярховыя панэльныя дамы для каго заўгодна. Але нёзабаве, магчыма, поле выбару яшчэ пашырыцца. Аб неабходнасці вярнуць дзяржаўны заказ на будаўніцтва індывідуальных дамоў сказаў **прэм'ер-міністр краіны Раман ГАЛОЎЧАНКА.**

«Фізічным асобам неабходна даць магчымасць купіл гатовага індывідуальнага жылля замест самастойнага будаўніцтва, якое часта расцягваецца на доўгія гады, жыллё не ўводзіцца ў эксплуатацыю па розных прычынах», — лічыць прэм'ер-міністр.

На яго погляд, неабходна адналіць такое панятце, як дзяржаўны заказ у будаўніцтве жылля, меры для чаго ўжо прымаюцца. Рэгулятарам гэтых пытанняў выступае Мінбудархітэктуры. Сумесна з зацікаўленымі праведзена пэўная работа па выпрацоўцы падыходаў да пытання вырашэння назапашаных праблем у будаўніцтве і распрацаваны праекты адпаведных нарматыўна-прававых актаў (цэлы пакет). На думку міністэрства, іх рэалізацыя дасць магчымасць выканаць праграму жыллёвага будаўніцтва і сёлета, і ў пяцігоддзі ў цэлым.

А ВОСЬ ТАК РАБІЦЬ НЕ ТРЭБА...

Мы неаднойчы пісалі пра тое, як ашуканцы падманваюць наіўных гасцей сталіцы, якія гатовыя пераводзіць невядомым грошы ў якасці броні за здымныя «квадраты». Гэтая схема разводу даўно на слыху, але ўсё роўна знойдуцца тыя, хто вырашыць правярыць яе ў справе. Падрабязнасцямі чарговай гісторыі пра лжэарэндадаўцаў падзяліліся ў Першамайскім РУУС сталіцы.

На гэты раз ахвярамі махляроў сталі тросе жыхароў Мінска, якія вырашылі зняць сталічныя апартаменты. Аб'явы аб здачы кватэр знайшлі на адкрытых анлайн-пляцоўках. Калі падыходзячы варыянт быў знойдзены, не міргнуўшы вокам, перавялі ашуканцам грошы за бронь.

«У месенджары яны звязаліся з патэнцыяльнымі арэндадаўцамі, якія папрасілі ўнесці перадаплату, — расказвае падрабязнасці **старшы інспектар Першамайскага РУУС Мінска Кацярына ДАБРАВОЛЬСКАЯ.** — Пасля пераводу грошай «уладальнікі» кватэр перасталі выходзіць на сувязь, а таксама выдалілі аб'явы і перапіску».

Пацярпелыя пазбавіліся ў агульнай складанасці не толькі больш чым 1000 рублёў, але і абяцанага даху над галавой. На факце махлярства ўзбуджана крымінальная справа.

Сяргей КУРКАЧ.

У тэму

У БАРАНАВІЧАХ ВЫЯВІЛІ «ШЭРЫХ РЫЭЛТАРАЎ»

У гэтым горадзе некалькі гадоў праварочвалі махінацыі «шэрыя рыэлтары», паведамілі ў Следчым камітэце. Двое знаёмых (аднаму з іх 47 гадоў, другому — 31) яшчэ ў 2022 годзе пачалі шукаць людзей, якія мелі даўгі па «камуналцы» і прыватызацыйных выплатах. Затым уцяралісь ў давер і прапаноўвалі свае дапамогу ў пагашэнні запазычанасці і далейшым продажы кватэры. Пасля яны абяцалі чалавеку купіць больш таннае жыллё і вярнуць астатнюю суму.

Афарміўшы даверанасці на сваё імя, мужчыны прадавалі нерухомасць звычайным пакупнікам, а былых гаспадароў пераселялі ў дамы з горшымі ўмовамі. Натуральна, ніякіх грошай ім не выплачвалі.

І ўсё ж злачынную схему ўдалося раскрыць. На сёння следчыя ўстанавілі двух пацярпелых, чыімі кватэрамі завалодалі «бізнесмены». Шкода склала больш за 90 000 рублёў.

У дачыненні да беларуса распачата крымінальная справа паводле частак 4 артыкула 209 КК РБ («Махлярства, учыненае ў асабліва буйным памеры»). Максімальнае пакаранне па гэтым артыкуле — 10 гадоў пазбаўлення волі.

Андрэй ХУДЫК:

«З КОЖНЫМ ГОДАМ НАША КРАІНА СТАНОВІЦЦА БОЛЬШ ЗЯЛЁНАЙ»

Адзіны дзень азелянення прайшоў у суботу ва ўсіх кутках краіны. У рамках экалагічнай акцыі «Разам для зялёнай Беларусі!», прымеркаванай да Года якасці, высаджана больш як 128 тысяч саджанцаў ліпы, клёна, дуба, рабіны, граба, елкі, каштана і іншых раслін.

Такія «зялёныя» акцыі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя праводзіць традыцыйна вясной і ўвосень. На выніках 2023 года, пасаджана больш чым 346 тысяч дрэў і звыш 517 тысяч кустоў на прыдамавых і іншых тэрыторыях населеных пунктаў. Плошча азеленых тэрыторый у гарадах і раённых цэнтрах павялічылася на 901,11 га. У 131 населеным пункце краіны ўзровень азеляненія дасягнуў неабходных па экалагічных нормах і правілах 40 %.

У экалагічных акцыях удзельнічаюць не толькі супрацоўнікі сістэмы Мінпрыроды, але і не абыякавыя да прыроды грамадзяне.

Сёлета на заклік «Разам для зялёнай Беларусі!» адгукнулася каля 10 тысяч чалавек: прадстаўнікі прадпрыемстваў і арганізацый, устаноў адукацыі і грамадскасці. Дзякуючы сумесным намаганням плошча азеленых тэрыторый у нашых гарадах і вёсках няўхільна расце.

Адно са знакавых мерапрыемстваў адбылося ў паркавай зоне ў Першамайскім раёне сталіцы. Тут, на малаўпэўнен берасе Сляпянскай водная сістэмы, супрацоўнікі Зелянбуда і цэнтральнага апарата Мінпрыроды разам з **кіраўніком прыродаахоўнага ведамства Андрэем ХУДЫКАМ** заклалі алею з 55 вербаў.

— З кожным годам наша краіна становіцца больш зялёнай. З'яўляецца больш зялёных насаджэнняў у гарадах. Усё больш населеных пунктаў дасягае ўстаноўленага працэнта азеляненія, а гэта — у першую чаргу — здароўе нашых грамадзян. Па «зялёным» шляху рухаецца і наша эканоміка. Сённяшняя акцыя — працяг гэтай вялікай працы, — адзначыў Андрэй Худык.

Да пасадкі дрэў на берасе Сляпянскай водная сістэмы далучыліся і прадстаўнікі Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя (Белгідрамета).

— Белгідрамет заўсёды падтрымлівае Мінпрыроды ў такіх акцыях. І акцыя «Разам для зялёнай Беларусі!» не выключэнне. Сёння ў дапамогу выйшаў працоўным дэсантам амаль увесь калектыў Белгідрамета, — паведаміў **Андрэй КАРАБЧУК, начальнік службы міжнароднага супрацоўніцтва і сувязяў з грамадскасцю.** — На тэрыторыі Беларусі нашымі супрацоўнікамі будзе пасаджана прыблізна 2100 дрэў і каля 150 кустоў розных парод — альбо на сваіх тэрыторыях, альбо сумесна з абласнымі камітэтамі.

У рамках экалагічнай акцыі ў сталіцы таксама праводзіліся пасадкі на тэрыторыі зоны адпачынку «Сняжота» ў раёне вуліцы Карзюкі, на праспекце Пераможцаў уздоўж МКАД, каля гандлёвага цэнтра «Першы нацыянальны гандлёвы дом», размешчанага на скрыжаванні праспекта Незалежнасці і вуліцы Кірылы Тураўскага. Збіраліся леташняя лістота, бытавое і будаўнічае смецце, сухія галінкі.

— Пытанні азеляненія Мінска знаходзяцца ў прыярытэтным кірунку, — паведаміла **намеснік старшыні Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя Таццяна ДУБІК.** — У Год якасці асабліва шмат увагі аддаецца якасці пасадачных матэрыялаў, тэхналогіі пасадкі, работ па доглядзе. Хацелася б нагадаць усім неабыякавым грамадзянам, што наш горад — чысты, прыгожы і зялёны. Дасягнуць гэтага выніку можна толькі сумесными намаганнямі.

Александрына ПАРШЫНА.
Фота Віктара ДРАЧОВА.

Далучайся!

ТАЛАКОЙ — ЗРУЧНА

Рэспубліканская акцыя «Адновім лясы разам» набірае абароты на Брэстчыне

Сёлета рэспубліканская акцыя Міністэрства лясной гаспадаркі краіны «Адновім лясы разам» стартавала на Брэстчыне, у Гарадзішчанскім лясніцтве Баранавіцкага лясгаса. Усяго на пасадку лесу разам выйшлі каля 80 чалавек, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, працоўных калектываў, моладзі.

Першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Аляксандр ДРАГУН, які ўдзельнічаў у акцыі, падкрэсліў, што сёлета асаблівая ўвага ўдзяляецца якасці. Важна забяспечыць не толькі аб'ём пасадак, але і высокую якасць работы, каб маладыя саджанцы добра прынялісь і ў свой час сталі дружнай лясной дзялянкай. Намеснік міністра паведаміў, што летась падчас падобнай кампаніі ў краіне было пасаджана крыху больш за шэсць тысяч гектараў лесу, у гэтым годзе плануецца пасадзіць на плошчы не менш за шэсць з паловай тысячы гектараў.

Намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім АЛЬШЭЎСКІ нагадаў, што акцыю «Адновім лясы разам» Брэсцкая вобласць пачынае адной з першых. Да гэтай пачэснай справы, якая накіравана на аднаўленне лясного багацця, на эканалагічны дабрабыт будучых пакаленняў, далучаецца ўсё больш людзей.

У Ганцавіцкім раёне першымі да акцыі далучыліся пярвічныя арганізацыі БРСМ на чале з першым сакратаром раённага камітэта Анастасіяй Гурман. У адзін з апошніх дзён сакавіка працоўны дэсант высадзіўся на тэрыторыі Кругавіцкага лясніцтва. На лясной дзялянцы добра папрацавалі прадстаўнікі пярвічных арганізацый Ганцавіцкага лясгаса і раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях.

А на Піншчыне добрую справу падтрымалі медыцынскія работнікі раёна. Цэлы атрад медыкаў накіраваўся ў прыгарадное лясніцтва. **Ала ВАЙТОВІЧ, урач па медыцынскай прафілактыцы Пінскай цэнтральнай паліклінікі,** сказала, што яны з калегамі ўмеюць не толькі лячыць людзей, але аказаліся і спраўнымі рабочымі па пасадцы лесу: «Дробны дождзьік не стаў перашкодай рабоце, мы працавалі з пачуццём уласнага дачынення да справы аднаўлення лясоў роднай краіны і паляпшэння навакольнага асяроддзя».

— Да пачэснай справы далучаюцца многія і многія жыхары абласнога цэнтра. У ліку першых акцыю падтрымалі вучні і настаўнікі школ, дзе працуюць школьныя лясніцтвы, — сказала карэспандэнту газеты **намеснік дырэктара па ідэалагічнай работе Брэсцкага лясгаса Ірына ФАНДОРКА.** — Напрыклад, вучні са школьнага лясніцтва «Зялёная школа» брэсцкай СШ № 8 імя У. М. Карвата працавалі на пасадцы лясных культур у Мухавецкім лясніцтве. Хлопчыкі і дзяўчынкі пасадзілі дзялянку плошчай у паўгектара з саджанцаў сасны і бярозы. На наступны дзень акцыю падтрымала школьнае лясніцтва СШ № 14 імя Я. М. Фаміна ў гэтым жа лясніцтве. Вельмі адказна і старанна працавалі ўдзельнікі школьнага лясніцтва Чарнаўчыцкай сярэдняй школы Брэсцкага раёна ў 193-м квартале Чарнаўчыцкага лясніцтва.

Вучні Чарнаўчыцкай сярэдняй школы.

Вучні СШ № 8 горада Брэста.

Прадстаўнікі ўжо цэлага шэрагу школ Брэста выказвалі на пасадку дрэў. Напрыклад, вучні і настаўнікі сярэдняй школы № 37 пабывалі ў Мядзянскім лясніцтве Брэсцкага лясгаса. Школьнікі ганарацца тым, што зрабілі ўнёсак у агульную справу. На сайце школы яны пакінулі справаздачу аб выніках працоўнага дэсанта, паведамілі, што высадзілі 600 саджанцаў сасны, 500 — бярозы, 300 — ясеня, па 200 — дуба і клёна.

Талаку падтрымалі супрацоўнікі ўстаноў і арганізацый абласнога цэнтра, студэнты Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта.

— У Драгічынскім раёне акцыя набірае абароты, — паведаміла **намеснік дырэктара Драгічынскага лясгаса па ідэалагічнай рабоце Алена ТАЎСТЫКА.** — На канец гэтага тыдня працоўныя дэсанты запланавалі прадстаўнікі органаў дзяржаўнай улады, супрацоўнікі адзелаў МНС і Следчага камітэта, «Белдзяржстраха», іншых арганізацый. Папрацавалі ўжо члены БРСМ, школьнікі, навучэнцы каледжа. Такім чынам, добрая справа набывае ўсё больш прыхільнікаў.

Генеральны дырэктар Брэсцкага абласнога лесагаспадарчага аб'яднання Анатоль ЛЕВАНЮК паведаміў, што летась у Брэсцкай вобласці падчас акцыі было пасаджана каля 500 гектараў лесу, на гэты год запланавана звыш 600 гектараў, а ўсяго сёлета ў рэгіёне будзе высаджана больш за 2,5 тысячы гектараў лесу.

У Міністэрстве лясной гаспадаркі распрацавалі прыгожую наглядную агітацыю з нагоды акцыі. На адным з плакатаў напісана, што талака па аднаўленні беларускіх лясоў прысвечана Году якасці. Каб прыняць удзел, дастаткова звярнуцца ў найблізэйшае лясніцтва ці лясгас і заявіць аб свайм жаданні. Акцыя прадоўжыцца да 20 красавіка.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Брэсцкага лясгаса.

Меркаванне

ЯКАСЦЬ БЕЛАРУСКАЙ ГАСЦІННАСЦІ

Пра нашу беларускую гасціннасць мне ўжо даводзілася выказваць сваё меркаванне ў прэсе. Цяпер, калі 2024 год аб'яўлены Годам якасці, лічу неабходным вярнуцца да гэтай няпростай тэмы, якая закранае інтарэсы ўсяго грамадства.

Год якасці аб'яўлены з вялікімі мэтамі: гэта і павышэнне якасці жыцця насельніцтва краіны, і забеспячэнне канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі ў свеце, і стымуляванне ініцыятывы. Прэзідэнт Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам пастаўлена важная, змястоўная задача — сфарміраваць у грамадстве адказнасць за вынікі працы, за перадачу годнай спадчыны будучым пакаленням нашай краіны, зрабіць так, каб «якасць пранізвала кожнага чалавека».

Значыць, гэта датычыцца і якасці беларускай гасціннасці як абагульняльнага індыкатару якаснага жыцця беларускага народа.

«Гасціннасць — адзін з галоўных беларускіх брэндаў, якім мы вельмі ганарымся і перадаём з пакалення ў пакаленне», — так выказаўся кіраўнік дзяржавы на пачатку Года якасці, падкрэсліўшы, што гэты брэнд трэба развіваць і ўдасканальваць.

Магу пацвердзіць на ўласным вопыце: мне неаднойчы даводзілася чуць станоўчыя водгукі пра беларускую гасціннасць, пра высокую якасць беларускай прадукцыі як у блізкім, так і ў далёкім замежжы. Што і казаць: прыемна, калі за мяжой так гавораць пра нашу народ.

Дык што ж гэта такое — беларуская гасціннасць? Што ў ёй, сённяшняй, ад традыцыі мінулага, а якія новыя рысы яна набыла ў нашы дні?

Беларуская грамадства з даўніх часоў характарызуюць як талерантнае. Яшчэ з эпохі Вялікага Княства Літоўскага на гэтай тэрыторыі мірна суіснавалі розныя рэлігіі, розныя нацыянальнасці і розныя культуры. Традыцыі талерантнасці і міралюбівая знешняя палітыка беларускай дзяржавы з'яўляюцца трывалым падмуркам нашай гасціннасці, бо ўся гісторыя Беларусі грунтуецца менавіта на міры і згодзе прадстаўнікоў усіх народаў, якія жылі і жывуць цяпер на нашай зямлі.

